Рэспубліканскі сеткавы праект “Апорная метадычная пляцоўка – прафесійнай супольнасці”

Напрамак “Гісторыка-культурнае выхаванне”

Тэма апорнай метадычнай пляцоўкі “Выхаванне асобы на аснове культурна-гістарычнай спадчыны рэгіёна”

**“Традыцыі ў будучыню”: выхаванне грамадзяніна і патрыёта сродкамі праектнай дзейнасці.**

*Шпакава Аксана Андрэеўна, педагог дадатковай адукацыі*
*вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі,*
*кіраўнік ўзорнага тэатра моды “Аліса”,*
*Рубашка Яўгенія Міхайлаўна,педагог дадатковай адукацыі*
*гуртка “Чароўны пэндзлік”*
*Дзяржаўнай ўстановы дадатковай адукацыі*
*“Цэнтр дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна”*

**Анатацыя.** Адным з прыярытэтных напрамкаў развіцця Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе з’яўляецца выхаванне маладога пакалення на традыцыйных каштоўнасцях беларускага народа, дзе велізарную нішу займае народная дэкаратыўна-прыкладная творчасць. Яна – сведчанне вялікага таленту чалавека, сыходзіць каранямі ў шматвяковую гісторыю і з’яўляецца невычэрпнай крыніцай для фарміравання і рэалізацыі творчага пачатку ў дзяцей і моладзі, дазваляе пазнаваць гісторыю сваёй малой радзімы, яе культуру і традыцыі. Навучэнцы Цэнтра дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна добра разумеюць гэта і з багатай спадчынай роднага краю, яго таленавітымі землякамі знаёмяцца праз пазнавальныя творчыя праекты. У дадзеным артыкуле прадстаўлены матэрыялы з вопыту рэалізацыі пошукава-даследчых праектаў “Родныя вобразы”, “Традыцыі ў будучыню” і “Нябесныя бегі” ўзорнага тэатра моды “Аліса” і гуртка “Чароўны пэндзлік”.

Праектная дзейнасць, як адзін з метадаў развіваючага навучання, накіравана на выпрацоўку самастойных даследчых уменняў, садзейнічае развіццю творчых здольнасцей і лагічнага мыслення навучэнцаў, аб’ядноўвае веды, атрыманыя ў ходзе адукацыйнага працэсу, далучае да канкрэтных жыццёва важных праблем.

Для навучэнцаў праект – гэта магчымасць максімальнага раскрыцця свайго творчага патэнцыялу, дзейнасць, якая дазваляе праявіць сябе індывідуальна ці ў групе, паспрабаваць свае сілы, прыкласці свае веды, прынесці карысць. Вынік праектнай дзейнасці заўсёды носіць практычны характар і значны для саміх адкрывальнікаў.

Арганізацыя праектнай дзейнасці навучэнцаў з’яўляецца актуальнай, сучаснай і перспектыўнай адукацыйнай тэхналогіяй, якая дае магчымасць комплексна вырашаць пытанні навучання, выхавання, усебаковага развіцця асобы навучэнцаў.



Маляваныя дываны Я.Драздовіча - гісторыка-культурная нематэрыяльная каштоўнасць Беларусі.



*Глыбоцкая зямля мае багатую культурна-гістарычную спадчыну. Сапраўдным здабыткам глыбачан можна назваць маляванкі Язэпа Драздовіча, як яскравы прыклад твораў дэкаратыўна-прыкладной творчасці беларускага народа. Пра творчасць Язэпа Драздовіча напісаны дзясяткі дакументальных кніг і артыкулаў, знята мноства кінастужак. Маляваныя дываны Язэпа Драздовіча з’яўляюцца каштоўнымі экспанатамі музеяў і музейных пакояў не толькі на Глыбоччыне, але і па ўсёй Беларусі. На сёняшні дзень яны – гісторыка-культурная нематэрыяльная каштоўнасць нашай краіны.*

Падрастаючае пакаленне Глыбоччыны ганарыцца сваім таленавітым земляком і таму вялікую ўвагу надае знаёмству і папулярызацыі яго творчасці. Мэтанакіраваная работа ў гэтым напрамку ў Цэнтры дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна вядзецца ўзорным тэатрам моды “Аліса” і ў гуртку “Чароўны пэндзлік” праз праектную дзейнасць.

Першы праект, да якога мы звярнуліся, – пошукава-творчы праект “Родныя вобразы”. Асаблівы акцэнт у праекце зроблены на маляванкі, якія натхнілі гурткоўцаў на выраб сцэнічнай калекцыі адзення з адлюстраваннем “маляванак” знакамітага земляка.

У межах праекта яго дзельнікі пазнаёміліся з творчасцю Язэпа Драздовіча і пазналі пра гэта шмат цікавай інфармацыі. Язэп Драздовіч –беларускі жывапісец, скульптар, графік, пісьменнік, фалькларыст, этнограф, археолаг. Па словах сведкаў, ён вандраваў ад вёскі да вёскі і астаўляў на памяць людзям свае маляваныя дываны на саматканым, пафарбаваным у чорны колер палатне. Любімымі яго матывамі былі мясцовыя начныя пейзажы. Кожная гаспадыня тых месцаў марыла мець малярства Язэпа Драздовіча. Акрамя пейзажаў на дыванах Драздовіча былі раслінныя ўзоры, вясёлыя звяры-музыкі, або помнікі беларускай архітэктуры – замкі, касцёлы, палацы.

Атрыманыя веды ўвасобілі ў вырабу калекцыі “Родныя вобразы”. У калекцыі восем касцюмаў. Яны простыя ў выкананні – у кожным камплекце блузка і спадніца. На спадніцах размясцілі ў меньшых памерах аўтарскія

копіі (рэпрадукцыі) маляванак Драздовіча. На блузках маюцца невялічкія элементы раслінных матываў маляванкі.

Калекцыя касцюмаў “Родныя вобразы”, выраблены па выніках праекта, мела вялікі поспех на розных мерапрыемствах не толькі ў горадзе, але і на абласных, рэспубліканскіх і міжнародных святах, конкурсах тэатраў моды, а веды, атрыманыя навучэнцамі падчас пошукава-даследчай дзейнасці, былі дастойна прадстаўлены на раённых і абласных канферэнцыях. Сярод значных конкурсаў – “Модны дывертысмент” у межах Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”, конкурс дзіцячай моды “Kids couture” у Наваполацку, рэспубліканскі конкурс “Юныя таленты Беларусі” ў Нацыянальным дзіцячым цэнтры “Зубраня”, рэспубліканскім конкурсе “Творчасць без межаў” і інш.

*Паказ калекцыі “Родныя вобразы”*



*Калекцыя “Родныя вобразы”. Адкрыццё выставы па маляванцы ў Віцебскім метадычным цэнтры народнага мастацтва.*



*Калекцыя “Родныя вобразы”. Дзень моладзі на Міжнародным фестывалі мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”*

Творчы пошукавы праект “Родныя вобразы” вельмі зацікавіў яго ўдзельнікаў – гурткоўцаў аб’яднанняў па інтарэсах пазнавальным матэрыялам і творчым вынікам, таму, як працяг, распрацавалі новы праект “Традыцыі ў будучыню”. Адметнай асаблівасцю дадзенага праекта з’яўляецца захаванне спадчыны Язэпа Драздовіча, яе адлюстраванне і развіцце ў дзіцячай творчасці.

Уся работа ў праекце падзяляецца на чатыры этапы: арганізацыйна-матывацыйны, інфармацыйна-даследчы, практычны і заключны, якія ўзаемазвязаны паміж сабой, што дазваляе планамерна дасягаць яго мэты. На працягу ўсяго праекта праводзіцца пошукава-даследчая работа па паглыбленаму знаёмству з творчасцю Язэпа Драздовіча не толькі ў тэхніцы “маляванка”, але і ў іншых вобласцях і накірунках дзейнасці. У выніку праекта – выраб сучаснай калекцыі адзення для моладзі “Глыбоцкі стыль” з элементамі маляванак, якая з’яўляецца маленькім ўнёскам у сучасную моду, бо да сёняшняга часу такіх калекцый адзення не існавала.

*Экскурсіі ў музеі*

*Дзіўны мір Я. Драздовіча*

*Імя і лёс Я.Драздовіча”*

*Арганізацыйна-матывацыйны этап* праекта прадугледжвае знаёмства з яго мэтай і задачамі, планам работы. Падчас адкрыцця праекта праводзіцца прэзентацыя рэалізаванага раней творчага праекта “Родныя вобразы” – калекцыі адзення з адлюстраваннем малюнкаў самаго Драздовіча.

*Інфармацыйна-даследчы этап праекта* пачынаецца з наведвання навучэнцамі і гутарак з супрацоўнікамі школьных і гарадской бібліятэк, Глыбоцкага Дома рамёстваў, гарадскога Цэнтра культуры, Глыбоцкага гісторыка-этнаграфічнага музея, музея Падсвільскай сярэдняй школы імя Героя Савецкага Саюза П.М. Казлова – кладзезя цікавейшай інфармацыі аб творчасці таленавітага земляка і дзе па сённяшні час захоўваюцца дываны, намаляваныя Язэпам Драздовічам. На дадзеным этапе шмат увагі надаецца збору і апрацоўцы архіўных матэрыялаў, дакументальнай і мастацкай літаратуры, яе сістэматызацыі. Цікавымі сталі размовы з мясцовымі жыхарамі, сведкамі сустрэч з Я. Драздовічам.



*Маляваныя дываны С.А. Скавырка – народнага майстра Глыбоччыны”*

Работа з інтэрнэт-рэсурсамі па тэме праекта дазволіла дапоўніць і зрабіць інфармацыю больш разнастайнай. Асаблівыя ўраджанні ў ўдзельнікаў праекта пакінула кінастужка “ Імя і лёс. Язэп Драздовіч”, пасля абмеркавання якой кожны ўдзельнік праекта быў ураджаны лёсам земляка.

*У інфармацыйна-даследчы этап* праекта ўключана знаёмства з сучаснымі майстрамі маляванкі, сярод якіх Святлана Анатольеўна Скавырка –народны майстар Беларусі па маляванцы з Глыбокага. С.А. Скавырка правяла майстар-клас па тэхніцы маляванкі і пазнаёміла навучэнцаў з асноўнымі прыёмамі малявання дываноў. Атрыманыя навыкі і ўменні дапамаглі ім у выкананні ўпрыгожвання калекцыі “Глыбоцкі стыль”.







*На майстар-класе ў Доме рамёстваў. Навучэнцы пераймаюць вопыт у народнага майстра С.А.Скавырка*

Папрысутнічаўшы на майстар-класе па роспісу маляванкі распрацавалі эскізы і мадэлі адзення з элементамі маляванак, такім чынам распачалі *практычны этап рэалізацыі праекта.*

| | | | |
|---|---|---|---|
|  | На эскізе – халат з карманамі і кароткімі рукавамі. На карманах і па краю рукавоў вырабу – ручны роспіс у стылі маляванкі. |  | У дадзеным камлекце – сарафан і берэт. Ніжняя частка сарафана па вуглу і ў версе па сярэдзіне мае ўпрыгожванне элементамі маляванкі. Па краю берэта – маляваныя кветкі. |

| | | | |
|---|---|---|---|
|  | Камплект з трох прадметаў: панамка, спадніца і скарочаны пінжак. На спадніцы па пярэдняй частцы ідуць элементы маляванкі. Такія ж упрыгожванні на пінжаку па спінцы і па краю панамкі. |  | Камплект з двух прадметаў – штаны і пінжак сярэдняй дліны с капялюшам. Элементы маляванкі як аздабленне на рукавах і штанах па баках. |

| | | | |
|---|---|---|---|
|  | Камплект з двух прадметаў – кардыган і хусцінка-бандана. Элементы маляванкі знаходзяцца на лацканах і вялікіх карманах кардыгана. |  | Сукенка з доўгімі рукавамі. У разрэзах ніжняй часткі сукенкі – ўстаўкі з элементамі маляванкі. |

| | | | |
|---|---|---|---|
|  | Камплект з топа і спадніцы. На спадніцы вялікі карман і ўстаўка размаляваны раслiннымі матывамі. |  | Сарафан з устаўкамі нанаперадзе спадніцы, размалёванымі ў стылі маляванкі. |

На дадзеным этапе навучэнцы сустрэліся з сучаснымі дызайнерамі адзення швейнай вытворчасці г. Глыбокае таварыства з абмежаванай адказнасцю “Старт ЛТД”. Правялі работу з інтэрнэт-рэсурсамі на тэму сучаснага моладзевага адзення. Атрыманыя веды дапамаглі ў распрацоўцы эскізаў мадэляў да калекцыі “Глыбоцкі стыль”. Для яе вырабу абралі габардзінавую тканіну чорнага колеру. Пасля эскізнага варыянту прыступілі да творчай работы па вырабу калекцыі.

Для гатовай калекцыі выставачнага варыянту распрацавалі лагатып калекцыі. На ім – эпізод з “маляванкі” Язэпа Драздовіча і назва калекцыі. Такім чынам, удзельнікі праекта не толькі глыбей пазнаёміліся з творчасцю таленавітага земляка, але і вырабілі сучасную калекцыю моладзевага адзення “Глыбоцкі стыль”.

*Артыкулы. Я.Драздовіч*

*Лагатып да калекцыі "Глыбоцкі стыль"*

*На заключным этапе* паводле праведзенай пошукава-даследчай працы правялі міні-канферэнцыю ўдзельнікаў праекта, якія падзяліліся вынікамі з іншымі навучэнцамі Цэнтра дзяцей і моладзі, правялі прэзентацыю на педагагічным савеце ўстановы. Акрамя таго, праект “Традыцыі ў будучыню” прэзентаваны на раённым і абласным этапах рэспубліканскага конкурсу “100 ідэй для Беларусі”, на рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 135-годдзю з дня нараджэння Язэпа Драздовіча пры ўдзеле супрацоўнікаў аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Цэнтра даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа, Глыбоцкага райвыканкама. Калекцыя “Глыбоцкі стыль” прадстаўлена на абласных святах і конкурсах, адзначана дыпломамі і граматамі конкурсаў “Модны дывертысмент” у межах Міжнароднага фестывалю мастацтваў

*Падчас прэзентацыі калекцыі.*

“Славянскі базар у Віцебску”, абласным этапе рэспубліканскага конкурсу “Здравствуй,мир!”, адкрытага конкурсу дзіцячай моды “Kids couture” у Наваполацку і інш.




*Калекцыя аддзення "Глыбоцкі стыль"*

Вывучэнне жыцця і творчасці таленавітага земляка Язэпа Нарцызавіча Драздовіча ўдзельнікамі ўзорнага тэатра моды “Аліса” і гуртка “Чароўны пэндзлік” прадоўжана праз тэму космаса. На падставе гэтага атрымаў развіццё новы пошукава-даследчы праект “Нябесныя бегі”. Цікавасць да гэтай тэмы і актуальнасць дадзенага праекта абумоўлена яшчэ і тым, што ў 2024 годзе Рэспубліка Беларусь стала касмічнай дзяржавай, а беларуска Марына Васілеўская – першым касманаўтам у гісторыіі незалежнай Беларусі. Праект “Нябесныя бегі” – наш невялікі ўнёсак у развіццё дазенай тэмы ў краіне.

*Кінастужка "Зямля і неба Язэпа Драздовіча"*

Мэта дадзенага праекта: знаёмства з “касмічнай старонкай” творчасці Язэпа Драздовіча і выраб на яе аснове творчай калекцыі “Нябесныя бегі”.




*Першы падрыхтоўча–арганізацыйны, інфармацыйны этап* распачаўся даследчай дзейнасцю з наведвання раённай бібліятэкі, экскурсіі ў гісторыка-этнаграфічны музей горада Глыбокае, работай з інтэрнэт-рэсурсамі і абмеркаваннем накірункаў вывучэння незнаёмых старонак жыцця і дзейнасці Я. Драздовіча.

*Практычны этап пачалі* з рэалізацыі асноўных напрамкаў праекта і пашырэння ведаў аб незнаёмых старонках жыццядзейнасці таленавітага земляка. Асаблівую увагу надалі знаёмству з тэмай космаса ў творчасці Язэпа Драздовіча праз работу з дакументальнай літаратурай, знаёмства з рукапісамі Я. Драздовіча па тэме космаса і яго кнігай “Нябесныя бегі”. Выданне “Нябесныя бегі” (Небесные орбиты) было выдадзена аўтарам у 1931 годзе невялічкім тыражом і лічылася першым выданнем па астраноміі на беларускай мове. У ім ён выклаў шэраг сваіх тэорый аб космасе, паходжанні планет Сонечнай сістэмы.

*Выданне Я. Драздовіча "Нябесныя бегі"*

*Касмічныя серыі Я.Драздовіча*

Працуючы з інтэрнэт-рэсурсамі, знайшлі шмат відэа-матэрыялаў па тэме праекта. Не пакінулі без увагі удзельнікаў дакументальныя кінастужкі “Неба і зямля Язэпа Драздовіча”, “Імя і лёс Язэпа Драздовіча”, якія дазволілі глыбей пазнаць, адчуць сябе побач са знакамітым земляком. Усё гэта паспрыяла распрацоўцы эскізаў і мадэлей для вырабу новай творчай калекцыі “Нябесныя бегі”. Назву яна атрымала ад назвы кнігі Язэпа Драздовіча, з якой пазнаёміліся праназіранні аўтара за нябеснымі краявідамі.

Кожная мадэль калекцыіі мае сучасны від і лініі крою. Па асобных элементах маюцца малюнкі знакаў задыяку і выразаў з выдання Язэпа Драздовіча “Нябесныя бегі”.

*На заключным этапе* зрабілі мультымедыйную прэзентацыю праекта, у якой распавядалі аб жыцці і дзейнасці таленавітага земляка, дзе вялікую ўвагу надалі тэме космаса. Дадзены матэрыял быў прадстаўлены на метадычным савеце Цэнтра дзяцей і моладзі, дзе атрымаў добрую адзнаку. Творчая калекцыя “Нябесныя бегі” прадэманстравана на гарадскіх і раённых святах.




*Паказ калекцыі “Нябесныя бегі”*

Кожны ўдзельнік рэалізаваных праектаў праз творчасць Я. Драздовіча зразумеў, што цудоўнае – побач, што кожны з нас ганарыцца тым, што на Глыбоччыне нарадзіўся і пакінуў такую багатую спадчыну наш знакаміты зямляк. Гэта яго маляваныя дываны ведаюць ва ўсім свеце. Гэта ён не толькі вывучаў зоркі, але і стаў пачынальнікам касмічнай тэмы ў беларускім выяўленчым мастацтве. Праведзеная пошукава-даследчая работа пра жыццё, дзейнасць і творчасць Язэпа Нарцызавіча Драздовіча стала цікавай, захапляльнай і пазнавальнай, спрыяла фарміраванню ў навучэнцаў каштоўнаснага стаўлення да сваёй малой радзімы і пачуцця гонару за яе культурную спадчыну.

**Літаратура**

1. Горава, Г. Касмалагічныя тэзісы Язэпа Драздовіча ў кантэксце еўрапейскай касмалогіі і астраноміі / Г. Горава // Роднае слова. – 2010 – № 3
2. Народныя майстры і мастакі Віцебшчыны / калектыў аўт.: Л.У. Вакар [і інш.]. – Віцебск: Вшцебская абласная друкарня, 2011. – 440 с.
3. Починова, Н.В. Белорусская народная декоративная роспись: учеб.пособие / Н.В. Починова. – Минск: Вышэйшая школа, 2005. – 174 с.
4. Сахута, Я.М. Народнае мастацтва Беларусі / Я.М. Сахута. – Мінск:БелЭн, 1997. – 287 с.
5. Сахута, Я.М. Сучаснае мастацтва Беларусі / Я.М. Сахута. – Мінск: Беларусь, 2013. – 255 с.
6. Сільнова, Л. «Касмічны аўтограф» / Л. Сільнова // Книжный калейдоскоп. —2001 — № 2 — С. 2–3.
7. Язэп Драздовіч. Праз церні да зорак: успаміны, артыкулы, прысвячэнні, мастацкія творы / уклад. Міхася Казлоускага. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2014. – 543 с.
8. Язэп Драздовіч. Славутыя мастакі з Беларусі: навуква-папулярнае выданне / Язэп Драздовіч. – Мінск: Беларусь, 2013. – 96 с.